# САЛІГОРЦЫ ВЯДУЦЬ НАСТУПЛЕННЕ

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ СОЛИГОРСКА

Лічаныя дні засталіся да здачы першай чаргі Салігорскага калійнага камбіната. І таму асабліва адчувальны накал працоўнага напружання сярод будаўнікоў, мантажнікаў, слесараў-сантэхнікаў, аддзелачнікаў, механізатараў. Вялікае свята Кастрычніка яны сустракаюць выдатнымі працоўнымі справамі.

Па ўстанавіўшайся на будоўлі традыцыі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва падводзяцца кожную суботу. Лепшым з лепшых калектываў прадастаўляецца права ўзняць сцяг ударнай будоўлі, уручаюцца грашовыя прэміі. Выдатнымі справамі вызначаецца калектыў першага комплекса (начальнік тав. Левітас). Трэці раз яму прысуджаецца пераходны Чырвоны сцяг камітэта прафсаюза будаўнічага трэста № 3 і камітэта камсамола. Добрых поспехаў дабіліся і многія іншыя калектывы.

Герояў працоўнай вахты цёпла павіншавалі сакратар парткома трэста № 3 Часлаў Казіміравіч Анцілеўскі, старшыня камітэта прафсаюза трэста Мікалай Сяргеевіч Шынелін.

Слова прадастаўляецца кандыдату ў члены Прэзідыума ЦК КПСС, першаму сакратару ЦК КПБ Кірылу Трафімавічу Мазураву. Ад імя ЦК партыі Беларусі, Савета Міністраў рэспублікі ён цёпла віншуе будаўнікоў з дасягненнем высокіх вытворчых паказчыкаў, з наступаючым святам — 46-й гадавінай Вялікага Кастрычніка. Тав. Мазураў К. Т. жадае будаўнікам новых поспехаў у працы, у выкананні высокіх сацыялістычных абавязацельстваў па датэрміновай здачы першай чаргі калійнага камбіната.

На мітынгу будаўнікоў прысутнічалі старшыня Бюро ЦК КПБ па кіраўніцтву прамысловасцю і будаўніцтвам тав. Філімонаў, міністр будаўніцтва БССР тав. Жыжаль, намеснік міністра будаўніцтва тав. Кашчэеў.

...Пад урачыстыя гукі Дзяржаўнага гімна Беларускай ССР закалыхаўся ў паветры Чырвоны сцяг ударнай будоўлі. У гонар новых працоўных перамог яго ўзнялі брыгады т.т. Грыцэвіча, Драбцова, Сергіені, Занкевіча і Чаркасава.